# У ВЫЗВАЛЕНЫМ ГОМЕЛІ

*Ляжаў у коме дымны Гомель,
Бы цяжка зранены солдат.
Гудзеў вятроў асенні гомон
Сярод руін дамоў і хат.
Іх коміны — патухлай свечкой,
Як зла фашыстаў напамін.
І стаў войне рахунак вечный:
Забіты бацька, муж і сын...
Дзяды, бабулц з імі дзеці
Солдат страчалі баявых.
Г'асцінцам лепшым быу на свеце
Сухарык чэрствы для малых.
І парк стары над кручай Сожа
Глядзеў з надзеяй у ваду:
Адбудаваць мы город зможам,
Во ў нас жыве стварэння дух...
...Цяпер на свята Перамогі
Іду да Вечного огню,
Солдату бронзовому ў ногі
Без слоў удзячна поклонюсь.*